# Майстар-клас ад Таццяны Навумавай

Якая дзяўчынка не марыла у дзяцінстве атрымаць у падарунак прыгожую. ляльку? Мабыць, гэта было запаветным жаданнем кожнай маленькай феі. А яшчэ, каб у калекцыі абавязкова быў маленькі посуд, шмат убораў для прыгажужуні і нават сапраўдны лялечны домік. Але гэта сёння можна з лёгкасцю адшукаць усё пералічанае на прылаўках крамы, нават можна набыць ляльку, якая будзе размаўляць і рухацца, У савецкім жа дзяцінстве такой разнастайнасці не было. Калі ж перанесціся ў часы нашых бабуль, дык, наогул, мала хто ўспомніць, што гуляў з купленымі цацкамі. Лялькі, як і многія іншыя рэчы хатняга ўжытку, якімі карысталіся ў паўсядзённым жыцці, рабілі сваімі рукамі, укладваючы ў кожны выраб крупінку сваёй энергіі, шчырасці і дабрыні.

Шкада, што з года ў год цяжэй знайсці носьбітаў нацыянальных традыцый свайго рэгіёну. Вёскі радзеюць, а гэта значыць, што ўсё менш застаецца сведкаў, якія могуць расказаць нешта важнае. Таму варта задумацца: што раскажам і што пакінем сваім нашчадкам пасля сябе мы. Пагадзіцеся, мы жывыя як народ, бо трымаемся найперш за свае карані, за традыцыі сваёй роднай зямлі. І як нельга зярнятку ўзрасці на бясплодным камені, так і чалавеку немагчыма выжыць і даць працяг роду ў духоунай пустэчы.

Хоцімскі Дом рамёстваў — месца нікальнае, тут майстры, прафесіяналы сваёй справы, свята паважаюць, захоўваюць і перадаюць будучым пакаленням самыя лепшыя беларускія традыцыі. І сённяшняе наша знаёмства менавіта з такім чалавекам, а яшчэ нас чакае цікавы майстар-клас спецыяльна для карэспандэнта “ШК”.



У асаблівым прадстаўленні Таццяна Навумава, метадыст і майстар Дома рамёстваў, не мае неабходнасці. Думаю, кожнаму хацімчаніну падчас разнастайных выставак, што праходзілі ў нашым раёне, даводзілася не толью любавацца лялькамі, якія робіць Таццяна Мікітаўна, але і набываць іх для сябе.

— Калі пачала цікавіцца лялькамі? О, зараз мне здаецца, што тэта было вельмі даўно. Можа яшчэ як толью нарадзілася, — жартуе майстар. — Але, калі мы былі малымі, такой разнастайнасці ў крамах не было. Таму першыя

мае лялечкі былі нескладанымі і прымітыўнымі. Недзе кавалачак ці шматок непатрэбнай старой спадніцы ці сукенкі дастанеш, накруціш, наматаеш, ці сучок нейкі з дрэва адламаеш. Крыху фантазіі, спрыт рук — і вось ужо лялька гатова. Але яны здаваліся тады такімі міленькімі і прыгожанькімі. А калі яшчэ атрымаецца некалькі ўбораў для цацкі зрабіць, дык і наогул радасці не было канца-краю. І лялькі, і гульні з імі — усё прыдумвалі самі. І тэта было па-сапраўднаму запамінальна і цікава. Мабыць, таму і здаецца, што займаюся IX вырабам з самага дзяцінства. Але зараз гэта ўжо больш на прафесійным ўзроўні: літаратуры шмат чытаю, ведаю аб ролі, значэны кожнай прыгажуні, паэтапным яе “нараджэнні”.

— Таццяна Мікітаўна, раскажыце, калі ласка, аб некаторых сваіх прыгажунях.

— У наш век лялькі ў асноўным дзіцячыя цацкі, у старажытнасці ж да іх былі зусім іншае стаўленне. Яны былі вельмі рознымі, і вырабляліся не толькі з тканіны, але і з іншых матэрыялаў: гліны, саломы і інш. Лялькі былі абярэгамі, неслі ў сабе добры пачатак і кожная выконвала сваю ролю. А вырабляць іх маглі толькі жанчыны. Лічылася, што ад якасці працы залежыў лёс не толью асобнай сям’і, а нават цэлага роду. Усе цацкі звычайна падзяляліся на абрадавыя, абярэгавыя і гульнёвыя.



— Найпрыгажэйшыя лялькі выдатнага майстра Т.М. НАВУМАВАЙ

Напрыклад, у ноч з 6 на 7 ліпеня святкуюць самае старажытнае абрадавае свята — Купалле. Адным з асноўных дзеянняў гэтага свята з’яўляецца пошук міфічнай «папараць-кветкі». Лічыцца, што з імі адыходзілі ўсе нягоды і непрыемнасці. Дарэчы, век у абрадавых лялек быў нядоўгі, звычайна іх спальвалі на агні, — дзеліцца Таццяна Мікітаўна, падыходзячы да шафы, у якой красуюцца лялькі, і адна за адной дастае прыгажунь. — Раней, для тага, каб у доме быў дастатак, жанчына рабіла ляльку “зернавушку” або “крупенічку”. Рабілася яна звычайна пасля збору ўраджаю. У аснове такой лялькі быў мяшэчак з зернем. “Зернавушка” займала самае ганаровае месца ў хаце — “чырвоны кут”. А вясной жменьку зярна, што знаходзілася ў мяшэчку, змешвалі з астатем зернем. Лічылася, толькі тады будзе добры ўраджай. Дарэчы, яшчэ да нараджэння было прынята рабіць невялічкую лялечку “кувадку” і класці яе ў люльку, каб тая абагрэла яе для будучага дзіця, а таксама адагнала ад яго злых духаў. Калі ж немаўля з’ўлялася на свет, лялька і тады не раставалася з ім. Напрыклад, калі бацькі ішлі ў поле на працу, і дзіця заставалася ў доме, глядзела на гэтыя

маленькя цацачкі і гуляла. А вось, напрыклад, маладой пары на шлюб дарылі «неразлучнікаў» — пару лялек з адной агульнай рукой, каб у сям'і панавалі згода і лад. Абавязкова ў кожнай хаце была лялька з лячэбнымі зёлкамі, якую называлі “траўніца”. Гэта лялька сачыла за добрым сном дзетак. І дзіця заўсёды дыхала свежым і добрым паветрам: мятным, чабаровым, рамонкавым. Ці вось “вэпская лялька”. Яе рабіла маці са старой сваёй вопраткі, без выкарыстання нажніцаў і іголкі: каб жыццё дзіцяці было гладкае і спакойнае. Дарэчы, перад замужжам маці дарыла дачцы “берагіню”. І цяперашні атрыбут любога вяселля — прыгожая лялька на вясельным аутамабілі — адгалосак менавіта таго старадаўняга абраду. А вось, напрыклад, “конь” лічыўся мужчынскім абярэгам і прыносіў дабрабыт, шчасце і поспех. Расказваць пра кожную з іх можна бясконца доўга і гэта па-сапраўднаму вельмі цікава.

— Можа ёсць нейкія асаблівыя сакрэты, аб якіх трэба ведаць?

— Як ужо адзначалася раней, лялек рабілі пераважна жанчыны. Лічылася, што жаноцкая доля ва усе часы была нялёгкай, і таму ў ляльках яны шукалі нейкай дапамогі і падтрымкі. Чаму ў іх не было твару? Лічылася: хто мае твар, мае і душу. Абавязкова трэба было рабіць цацкі ў добрым настроі і з добрымі думкамі. У вялікія святы займацца рукадзеллем не дазвалялася. Самымі ахоўнымі лічыліся лялькі, што выконваліся без выкарыстання іголак і нажніц. Тканіну, што выкарыстоўвалі, стараліся не рэзаць, а рваць. Дарэчы, матэрыял для вырабу цацак браўся са старых рэчаў, якія апраналіся на нейкія радасныя падзеі, напрыклад, на вяселле народзіны.



Дар'я КОРНЕВА (справа) і Алена ШЧАРБАКОВА, працаўнікі Хоцімскага ГКМ, таксама займаюцца стварэннем цудоўных лялек

— Вельмі цікава. Здавалася б, слухала вас і слухала. А я вось бачу ў вас вялікая колькасць розных узнагарод. Раскажыце крыху аб гатым.

— Сапраўды, з кожным годам капілка папаўняецца, бо мы стараемся актыўна ўдзельнічаць у розных мерапрыемствах, выстаўках і фэстах. Вось, напрыклад, у 2016 годзе праходзіў абласны агляд-конкурс “Магілёўская лялька ў рэгіянальным строі”. Было некалькі пераможцаў, але я атрымала галоўны прыз — Гран-пры конкурсу і тытул абсалютнага галоўнага пераможцы. Хачу сказаць, што ляльку для конкурсу рабіла каля двух месяцаў, бо прыйшлося прапрацоўваць усё да малейшых дробязяў. Запомніўся XX Міжнародны фестываль песні і музыкі “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”, дзе таксама

заняла 1 месца. У кожнага мястэчка свае традыцыі і асаблівасці, нават часам дзве вёсачкі, якія знаходзяцца паблізу, маюць шмат адрозненняў у тэхнщы выканання лялек. Але самае цікавае ў падобных мерапрыемствах — новыя знаёмствы і назапашаны вопыт.

— Ведаю, у вас дачушкі. А яны таксама умеюць рабіць такую, прыгажосць?

— Безумоўна, дзяўчатам вельмі падабаецца рукадзельнічаць. Я з самага дзяцінства любіла нешта зрабіць для іх сваімі рукамі. Яны падраслі, цяпер фантазіруюць і робяць розныя вырабы самі. Напрыклад, калі збіраюцца кудысьці у госці — абавязкова зробяць шкатулачку ці рамачку. Тое, што зроблена сваімі рукамі і з душой, заусёды успрымаецца на “ура”.

— На базе Дома рамёстваў працуе гуртол “Чароўны мір лялек”. Рабяты з вялікім захапленнем яго наведваюць і вучацца рабіць цацкі. Таццяна Мікітаўна, а можаце і для мяне правесці! Майстар клас?

— А як жа. Сёння мы паспрабуем зрабіць адну з самых важных і цікавых лялек, якая называецца “на шчасце”.

І вось тут пачалося самае цікавае. Дарэчы, крыху скажу пра ляльку, якую мне давялося рабіць пад чулым кіраўніцтвам Таццяны Навумавай. Лялечка “на шчасце” — народная лялька-абярэг. Гэта маленькая дзяўчынка з вельмі доўгай касой і паднятымі да сонейка ручкамі лічыцца, калі насіць ляльку з сабой будзе спадарожнічаць поспех. Калі прызнацца, я асабліва ніколі не займалася рукадзеллем, але жаданне заўжды прысутнічала. Здаёцца, апошні раз тэта было недзе ў школе на ўроках працы. Таму зрабіць нешта сваімі рукамі было неяк хвалююча. Не буду апісваць паэтапны майстар-клас, але прызнаюся — мне было вельмі цікава, хоць і не вельмі проста. Трэба адзначыць, што абярэг, які мы рабілі, не самы складаны, але на яго пайшла цэлая гадзіна, улічваючы, што ўсе нарыхтоукі ужо былі. Інакш, часу патрабавалася б значна больш. У прынцыпе, каб змайстраваць нешта падобнае абавязкова спатрэбіцца добры настрой, жаданне і, безумоўна, матэрыял. У выніку лялечка-красунечка атрымалася — ні ў казцы сказаць, ні пяром напісаць.

А вось Дар'я Корнева і Алена Шчарбакова, працаўніца Хоцімскага гісторыка-краязнаўчага музея, лялькамі сталі займацца зусім нядаўна, недзе каля года. Як прыйшла ідэя — неяк спантанна. Паспрабавалі раз другі — атрымалася. А сёння ў калекцыі дзяўчат ёсць ужо і беларускія абрадавыя, абярэггавыя, а яшчэ інтэр’ерныя тэкстыльныя лялькі.

— Дакладна не скажу, недзе каля 30 лялек у маёй асабістай калекцыі, у асноуным гэта лялькі-цільды, — расказвае навуковы супрацоўнік музея Дар'я

Корнева. — Інтэр’ерная лялька папулярная ў кожным куточку зямлі. З яе дапамогай не толькі ўпрыгожваюць дызайн, але іх яшчэ калекцыяніруюць.

Асаблівым попытам карыстаюцца хоцімскія лялькі-абярэгі, але ўсё часцей людзі жадаюць імі проста упрыгожыць інтэр’ер.

Дзяучаты расказалі, што на выраб адной цацкі ў сярэднім затрачваецца ад трох да пяці дзён, у залежнасці ад памеру і прапрацоукі дробных дэталей. Зрабщь інтэр’ерную ляльку-паўсправы, яе яшчэ трэба цікава распісаць. І вось тут дзяўчаты праяўляюць сваю фантазію. Але, калі занятак прыносіць задавальненне не шкада ні часу, ні матэрыялаў, якія яны ў асноўным бяруць з рэчаў, якія ужо непатрэбныя. Расказы і майстар-класы па вырабу сувеніраў асабліва падабаюцца дзеткам, якія прыходзяць у музей, каб паслухаць і самім навучыцца зрабіць падобныя рэчы.

Да кожнага свята Дар’я і Алена робяць новых і цікавых лялек, і наперадзе ў іх яшчэ мноства задум. Даша сёння з удзячнасцю ўспамінае, як недзе класе ў пятым, яна з задавальненнем наведвала гурток “Кройкі і шыцця”, дзе і навучылася асновам майстэрства. А навучыла яе тады рукадзельнічаць Таццяна Навумава.

І гэта вельмі прыемна, што традыцыйна на Хоцімскай зямлі зберагаюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне. А гэта значыць, што мы моцна трымаемся за свае карані, за традыцыі сваёй роднай хоцімскай зямлі.

**Вольга ЗАЙЦАВА**

**Зайцава, В.** Майстар-клас ад Таццяны Навумавай / Вольга Зайцава // Шлях Кастрычніка. — 2019. — 27 студзеня. — С. 4.